# Алегарычны змест казкі Якуба Коласа “Жывая вада”

Мэты:

1. *Данесці да вучняў асноўны пафас твора, раскрыць веру пісьменніка ў духоўныя сілы чалавека, ствральны патэнцыял народа.*
2. *Развіць уменне складаць план, знаходзіць вобразныя сродкі, развіваць звязнае маўленне.*
3. *Выхоўваць у вучняў экалагічную культуру, здольнасць асільваць нягоды, верыць у свае сілы, быць аптымістамі.*

Ход урока

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Актуалізацыя ведаў вучняў.**

Якія творы называюцца казкай?
Як называецца казка, напісаная аўтарам?
З якімі літаратурнымі казкамі вы знаёмыя?
Як вы думаеце, пра што будзе казка “Жывая вада”?
Напішыце, калі ласка, свае асацыяцыі, звязаныя з гэтым словам.

3. **Чытанне казкі па частках загадзя падрыхтаванымі вучнямі, складанне плана .** (Дадатак 1)

1. Жыватворная рака.
   а) Шчаслівы куточак.
   б) Гара.
2. Мёртвае поле.
   а) Злосць людзей на гару.
   б) Пошукі жывой вады.
3. Суш.
   а) Прырода і людзі просяць ратунку.
   б) Чорная хмара.
4. Выратаванне.
   а) Жывая вада змагаецца з гарою.
   б) Гнеў зямлі.
   в) Мёртвае поле ажыло.

**4. Аналітычная гутарка па творы.**

Як вы думаеце, які чалавек лічыць сябе шчаслівым?
Што, на думку пісьменніка, робіць жыццё чалавека паўнавартасным?
Што было гарантам шчаслівага жыцця людзей?
Чаму такую назву атрымала рэчка?
Якое з выказванняў вядомых людзей пра ваду адпавядае гэтай частцы твора? (Дадатак 2)
Хто вінаваты ў тым, што некалі багаты край стаў бяднець?
Як паводзілі сябе людзі?
Што іх прымушала ахвяраваць сваім жыццём?
Якуб Колас супрацьпастаўляе Мёртвае поле і Жывую ваду. Як называюцца словы “жывы” – “мёртвы”?
І адно і другое слова мнагазначнае. Давайце падбяром сінонімы да гэтых слоў.
*Жывы – поўны жыццёвых сіл, дзейсны, ажыўлены, рухомы, зменлівы, ствральны.*
*Мёртвы – засохлы, бясплодны, апусцелы, застылы, нямы, безжыццёвы.*
Якое выказванне адпавядае другой частцы твора? (Дадатак 2)

А ці ведаеце вы, што мы дома можам стварыць ваду, здольную лячыць, дапамагаць нам ачысціць сябе, сваё цела, энергію, а таксама жыццёвае асяроддзе ад негатыву і мёртвай энергіі. Як гэта зрабіць? Паслухайце паведамленне. (Дадатак 3)

**5.Фізкультхвілінка**

**6.Табліца "Як паводзіла сябе прырода?"**

Пра што трэцяя частка тэксту?
Запоўніце табліцу апісаннем дзеянняў прыроды.
Якія вобразныя сродкі выкарыстоўвае пісьменнік?

| Лес, поле, луг | Каласы ў полі | Трава і кветкі | Зямля | Камяні |
|---|---|---|---|---|
| Гаротнаю мальбою пазіралі на неба, прасілі прагнаць сваю смагу. | Жаласнаківаліся, кланяліся зямлі, падымаліся к небу , нібы просячы ратунку. | Ціхутка шапталі ветру аб сваёй нядолі. | Зямля зморшчылася, пакалолася, плакала. | Нылі ад спёкі, лопаліся. |

Якое выказванне можна суаднесці з трэцяй часткай? (Дадатак 2)
Што паспрыяла разбурэнню злых сіл?
Якая асноўная думка твора? Зачытайце.
Зачытайце выказванне пра ваду, якое адпавядае чацвёртай частцы твора? (Дадатак 2).
Як вы разумееце гэтыя словы?
Што такое алегорыя?
У чым заключаецца алегарычны змест твора?
*Жывая вада – дабро, вера, аптымізм.*
*Мёртвае поле – зло, цяжкасці, выпрабаванні.*
Акрамя таго, што аўтар упэўнены і пераконвае нас у тым, што дабро заўсёды перамагае, гэты твор мае яшчэ больш глыбінны філасофскі сэнс. Аўтар у ім выказвае аптымізм, веру ў перамогу народных сілаў. Гара – сімвал чужога, бар'еру на шляху свабоднага развіцця народа. Яна будзе змыта морам, утвораным з людскіх слёз. Арлы і каршуны – алегорыя на акупантаў і крыўдзіцелей, якія звілі гнёзды на райскай зямлі, дзе струменіцца Жывая вада. У рэшце рэшт Мёртвае поле ажыве, жыццё паступова наладзіцца, усё ўвойдзе ў сваё русла.

**7. Рэфлексія.**

Чаму твор названы пісьменнікам "Жывая вада", а не "Мёртвае поле", хоць апісанню апошняга адведзена больш месца?
Разгледзьце малюнак (парастак, які прабіваецца скрозь асфальт). Ці сугучны гэты малюнак асноўнай думцы твора?
Чаму яшчэ навучыў вас гэты твор? (Берагчы ваду)
Што павінны рабіць мы , будучае пакаленне , якому нашы прадзеды пакінулі ў спадчыну бясцэнны скарб – Зямлю, Жывую Ваду?

**8.Падвядзенне вынікаў урока, выстаўленне адзнак. Каментарыі.**

(Калі ўрок спадабаўся , то паапладзіруйце адзін аднаму, гучнасць вашых апладысментаў будзе залежыць ад ступені задавальнення сваёй дзейнасці на ўроку.)

**9. Дамашняе заданне**:

Скласці міні –разважанне "Ці трэба берагчы ваду? "

Дадатак 1

***План***

| | |
|---|---|
| 1. Жываносная рака.<br>а)<br>б)<br>2. Мёртвае поле.<br>а)<br>б)<br>3. Суш.<br>а)<br>б)<br>4. Выратаванне.<br>а)<br>б)<br>в) | <br>*Гнеў зямлі*<br>*Шчаслівы куточак*<br>*Злосць людзей на гару*<br>*Пошукі жывой вады*<br>*Чорная хмара*<br>*Гара*<br>*Жывая вада змагаецца з гарой*<br>*Мёртвае поле ажыло*<br>*Прырода і людзі просяць ратунку* |

Дадатак 2

1. Зямля – водная планета, на якой якасць вады вызначае якасць жыцця. Добрая вада – добрае жыццё. Дрэнная вада – дрэннае жыццё. Няма вады – няма жыцця (П.Блэйк).

2. Вадзе была дадзена чароўная ўлада стаць сокам жыцця на Зямлі (Л. Давінчы)

3. Вада, якая цячэ вечна, і ў скале прасячэ шлях (С. Рамішвілі).

4. Дрэва, трава, кветка і птушка
Не заўсёды могуць абараніцца.(В. Берастаў)

Дадатак 3

Японскія вучоныя на практыцы даказалі, што музыка, думкі, ідэі, словы людзей маюць уздзеянне на малекулярную структуру вады.

Вада з'яўляецца крыніцай жыцця на Зямлі. Але практычна ніхто не ведае, што вада можа запасаць тую ці іншую інфармацыю, у яе ёсць памяць як дадатнага, так так і адмоўнага характару. Вада лёгка мяняе сваю структуру пад уздзеяннем вібрацый і энергіі ў навакольным асяроддзі. У залежнасці ад захаванай інфармацыі яна можа быць як "жывой", так і "мёртвай". (Відэа: https://www.youtube.com/watch?v=WJFN85-LwVo)

Лічыцца, што "жывая" вада дае зарад жыццёвай энергіі.